# ТЭНДЭНЦЫІ І ПРАЕКТЫ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯЎ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**А. М. Нароўская,** *канд.гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Культурна-адукацыйная дзейнасць – адзін з асноўных кірункаў дзейнасці музеяў. Змест і формы адукацыйнай дзейнасці гэтых устаноў культуры распрацаваны з улікам дасягненняў сучасных гуманітарных ведаў і садзейнічаюць павялічэнню ролі музея як цэнтра актыўнага пазнання мінулага.

Сярод важных для нашага даследавання праблем тэарэтычнага характару, якія разглядаюцца вучонымі, можна выдзеліць сацыякультурнае ўзаемадзеянне музея і грамадства (Ю. У. Зіноўева) [4, с. 259–269] і стратэгіі камунікатыўных працэсаў у музеі (В. С. Сапанжа) [7]. Цікавае даследаванне музея як інфармацыйна-камунікатыўнай сістэмы праведзена С. В. Пшанічнай [6]. Істотную ўвагу музейнай камунікацыі ўдзяляюць даследчыкі М. Б. Гнядоўскі, У. Ю. Дукельскі [3, с. 16–18], М. А. Нікішын [5] , Л. М. Шляхціна [8, с. 125–139] і інш.

Вывучэнне культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў Гродзенскай вобласці выявіла, што буйнейшымі музеямі рэгіёна з’яўляюцца УК «Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей» (КП 170 000; НД 24 000 адзінак захоўвання); УК «Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі» (КП 61393; НД 17969); УК «Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя Пятра Іванавіча Баграціёна» (КП 36317; НД 10750); УК «Слонімскі раённы краязнаўчы музей імя Іосіфа Іосіфавіча Стаброўскага» ( КП больш за 23000); ДУ «Лідскі гісторыка-мастацкі музей» (КП 35512, НД 4929). Анкетаванне музеяў у снежні 2011 г. паказала колькасць музейных прадметаў у наступных установах: УК «Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей» (КП 11211; НД 10368); УК «Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку» (КП 5908; НД 2121); УК «Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей» (КП 9221; НД 4776 ).

Аналіз дзейнасці музеяў Гродзенскай вобласці сведчыць аб значным месцы ў ёй міжэтнічных культурна-адукацыйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мерапрыемстваў як з этнічнымі групамі, якія пражываюць на тэрыторыі рэгіёна, так і ў блізкім замежжы. На наш погляд, на гэта ўплывае вялікая колькасць нацыянальна-культурных аб’яднанняў у Гродзенскай вобласці, якіх у рэгіёне функцыянуе больш за 20: 5 польскіх аб’яднанняў (Саюз палякаў Беларусі, Таварыства польскай культуры на Лідчыне, Грамадскае аб’яднанне беларускіх палякаў Гродзеншчыны і інш.), 6 літоўскіх (гродзенскае аб’яднанне «Тэвінэ», лідская «Рута», радуньская «Гінтарас», Гервяцкая суполка літоўцаў, міжнародны клуб «Гервячай»), 4 яўрэйскіх (гродзенскі дабрачынны фонд «Нахум», Гродзенскае грамадскае аб’яднанне яўрэйскай культуры імя Л. Найдуса, гродзенскі яўрэйскі абшчынны дом «Мінора»), Грамадскае аб’яднанне татар г. Гродна і інш.

Усё гэта спрыяе стварэнню і правядзенню ў музеях міжнацыянальных культурна-адукацыйных праграм і мерапрыемстваў, устойлівасці талерантнага міжэтнічнага клімату ў рэгіёне. Так, у Доме-музеі Адама Міцкевіча ў г. Навагрудку адбываюцца штогадовыя конкурсы дэкламатараў польскай паэзіі, удзел у якіх бяруць вучні навагрудскіх школ. У 2011 г. у Доме-музее адкрылася сумесная нямецка-беларуская выстава «Беларуская гімназія ў г. Каме: права на адукацыю». Музейныя супрацоўнікі з г. Камы (ФРГ) не толькі бралі ўдзел у адкрыцці выставы, але і прачыталі лекцыю для школьнікаў г. Навагрудка аб выбітных беларусах у ФРГ. У сваю чаргу, вучні навагрудскіх школ наведалі музей у г. Каме. У 2011 г. Дом-музей Адама Міцкевіча заключыў дамовы аб супрацоўніцтве з польскімі музеямі: Музеем літаратуры А. Міцкевіча (Варшава) і Музеем рамантызму (Апінагура), якія будуць ладзіць не толькі выставы, але і праводзіць культурна-адукацыйныя праграмы.

Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей падтрымлівае цесныя сувязі з навагрудскай дыяспарай – беларускай, яўрэйскай, польскай. Музей з 2003 г. праводзіць семінары на тэму халакосту. З 2003 г. музей займаецца адукацыйнымі праграмамі па тэме «Халакост на Навагрудчыне» для настаўнікаў сярэдніх школ.

У Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі і Лідскім гісторыка-мастацкім музеі выкарыстоўваецца і такая форма культурна-адукацыйнай дзейнасці, як арганізацыя і ўдзел у фестывалях сярэднявечнай культуры «Наваградскі замак», «Меч Лідскага замка» і інш. Пры гэтым музеі займаюцца і папулярызацыяй гістарычных падзей. Навагрудскі гісторыка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчы музей актыўна бярэ ўдзел у арганізацыі навуковых канференцый. Так, у 2010 г. была арганізавана канферэнцыя, прысвечаная месцу і ролі навагрудскага асяродку ў гісторыі і культуры Еўропы. Сумесна з Інстытутам гісторыі НАН падрыхтаваны зборнік матэрыялаў канферэнцыі з вялікім дадаткам інфармацыі пра Грунвальд. Падчас фэсту музей ладзіў электронную прэзентацыю «Эпоха Вітаўта і Ягайлы» на грунце аўтэнтычных гістарычных матэрыялаў. У рамках фестывалю прайшоў «круглы стол», прысвечаны ролі Грунвальдскай бітвы ў айчыннай гісторыі.

Анкетаванне паказала, што кіраўніцтва і навуковыя супрацоўнікі музеяў Гродзенскай вобласці разглядаюць культурна-адукацыйную дзейнасць як адзін з вядучых кірункаў музейнай працы, праз які рэалізуецца адукацыйна-выхаваўчая функцыя музея. Формы культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў самыя разнастайныя. Да традыцыйных і найбольш распаўсюджаных у гэтым рэгіёне адносяцца экскурсіі, якіх у 2010 г. праведзена:

– Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку – 620;
– Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей – каля 400;
– Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна – 217;
– Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей» – 1638.

Ва ўсіх названых музеях экскурсіі праводзяцца на беларускай, польскай, рускай, нямецкай і англійскай мовах, што вельмі пазітыўна ўспрымаецца замежнымі наведвальнікамі.

Асноўнымі спажыўцамі прапануемых музеямі паслуг з’яўляюцца школьнікі, навучэнцы каледжаў, студэнты:

– Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку – 65–70 %;
– Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей – 62 %;
– Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей – 36 %.

Штогод, напрыклад, Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей наведвае прыкладна 600 турыстаў з іншых краін свету – Польшчы, Германіі, Ізраіля, Літвы, Расіі і інш. У 2011 г. Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку наведала каля 4500 турыстаў з Польшчы, Літвы, Кітая, Нідэрландаў. Адным з самых наведваемых музеяў рэгіёна застаецца Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей – 10 1894 наведвальніка.

Анкетаванне паказала, што колькасць наведвальнікаў музея не залежыць ад шматлікасці музейных прадметаў у фондзе і экспазіцыі музея ці штату навуковых супрацоўнікаў (у большасці музеяў 2 навуковых супрацоўніка), а ад брэнда музея, якасці сайта і шэрагу іншых прычын. Так, нягледзячы на тое, што Дом-музей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адама Міцкевіча ў Навагрудку мае наступныя паказчыкі: КП – 5908 музейных прадметаў; НД – 2121; 2 навуковых супрацоўніка, – у 2011 г. колькасць наведвальнікаў склала 22 274., з іх 13 тыс. (55%) у складзе экскурсійных груп; 11 тыс. (45%) індывідуальна.

Анкетаванне, праведзенае ў Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі, выявіла, што пры агульнай колькасці музейных прадметаў КП – 11 211 і НД – 10 368, 2 навуковых супрацоўніка музей у 2011 г. наведала каля 12 000 чал. (з іх 3952 – навучэнцы). Ваўкавыскі ваенна-гістарычны музей імя П. І. Баграціёна пры агульнай колькасці музейных прадметаў КП – 36 317, НД – 10 750 – па дадзеных на 01.10.2011; 4 навуковых супрацоўніка наведала 13 865 чал.

Для ажыццяўлення аддукацыйных праграм і распрацоўкі методык і зместу канкрэтных форм іх рэалізацыі ў музеях Гродзеншчыны праводзяць дыферэнцаваны падыход да розных груп наведвальнікаў. Музейная аўдыторыя падзяляецца па ўзроставай прыкмеце на дзіцячую (прыярытэтная група музейных наведвальнікаў) і дарослую, а таксама іншым прыкметам (сям'я, група ці індывідуальныя наведвальнікі, студэнты, наведвальнікі з абмежаванымі магчымасцямі і інш.).

Для школьнікаў агульнаадукацыйных школ Дом-музей Адама Міцкевіча ў г. Навагрудку прапануе музейныя заняткі па розных тэмах з улікам узросту:

– для дзяцей малодшага школьнага ўзросту: «Прывітанне, музей!», «Мой радавод і радавод А. Міцкевіча», «Беларускі фальклор у творчасці А. Міцкевіча», «Цікавыя і невядомыя рэчы ў кухні А. Міцкевіча»;

– для падлеткаў: конкурсы бардаўскай песні, штогадовы конкурс дэкламатараў польскай паэзіі, удзел у якой бяруць вучні навагрудскіх школ; прэзентацыя выставы з дэманстрацыяй відэафільма і з удзелам замежных гасцей;

– для студэнтаў: «Беларускі фальклор у творчасці А. Міцкевіча (балада «Свіцязь»)»; «Сувязь твораў Адама Міцкевіча з беларускім фальклорам (паэма «Гражына»)»;

– для дарослых: літаратурна-музычныя вечарыны (напрыклад, з бардам А. Камоцкім); песні філаматаў; творчыя сустрэчы (напрыклад, з доктарам гістарычных навук А. К. Краўцэвічам; прэзентацыя яго кнігі «Рыцары і дойліды Гародні»);

Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей прапануе заняткі па розных тэмах з улікам узросту. У перспектыве ставіцца задача

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стварэння некалькіх праграм музейных заняткаў з адпаведнымі цыкламі. У 2009 г. музей пачаў новую акцыю «Музей у валізцы», мэта якой пазнаёміць вучняў агульнаадукацыйных школ і навучэнцаў іншых устаноў з музейнымі прадметамі і тым самым зацікавіць іх наведаць музей.

Штогод супрацоўнікі музея распрацоўваюць новыя лекцыі з актуальнай тэматыкай. Музей з’яўляецца ініцыятарам і арганізатарам «круглых сталоў» на актуальныя тэмы. Цягам апошніх гадоў у Навагрудскім гісторыка-краязнаўчым музеі праходзяць «Сустрэчы ў музеі», у якіх бяруць удзел вядомыя людзі Навагрудчыны.

Навуковымі супрацоўнікамі Ваўкавыскага ваенна-гістарычнага музея імя П. І. Баграціёна распрацаваны заняткі па такіх тэмах, як «Старажытны Ваўкавыск», «З гісторыі зброі», «Грунвальдская бітва».

Асноўнымі кірункамі навукова-адукацыйнай дзейнасці Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея з’яўляюцца: 1) абанементнае і праграмнае абслугоўванне школьных груп (музейныя заняткі, лекцыі); 2) праца па-за музеем – у дзіцячых садках, школьных аўдыторыях; 3) правядзенне музейных вечарын, святаў, мерапрыемстваў.

Такім чынам, асаблівасцю ўсіх рэгіянальных музеяў з’яўляецца пераважная іх арыентацыя на вырашэнне адукацыйных задач, якім падпарадкоўваюцца ўсе астатнія. Прадметы камплектуюцца, захоўваюцца і экспануюцца галоўным чынам дзеля адукацыйных мэт. Найбольш распаўсюджанымі традыцыйнымі формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці з’яўляюцца экскурсіі, лекцыі, кансультацыі. Апроч іх, назіраюцца такія, як навуковыя чытанні (канферэнцыі, пасяджэнні), клубы (кружкі, студыі), конкурсы (віктарыны), сустрэчы з цікавымі людзьмі, канцэрты (літаратурныя вечарыны, тэатралізаваныя прадстаўленні), гістарычныя і рыцарскія турніры. Кожная з гэтых форм прысутнічае ў тым ці іншым праяўленні ў дзейнасці музеяў рэгіёна. Найбольш перспектыўнымі, на думку музейных супрацоўнікаў, з’яўляюцца экскурсіі, музейныя заняткі, літаратурныя і тэатральныя вечарыны, мультымедыйныя прэзентацыі выстаў і дыялогі з наведвальнікамі.

---

1. *Вяршыцкая, Т. Р.* Навагрудскі гісторыка-краязнаўчы музей / Т. Р. Вяршыцкая // Музеі Беларусі: давед. выд. – Мінск: БелЭн, 2008. – С. 440–441.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Гайба, М. П.* Міцкевіча Адама Дом-музей / М. П. Гайба // Музеі Беларусі: давед. выд. – Мінск: БелЭн, 2008. – С. 391–394.

3. *Гнедовский, М. Б.* Музейная коммуникация как предмет музееведческого исследования / М. Б. Гнедовский, Ю. В. Дукельский // Музейное дело: музей–культура–общество: сб. науч. тр. / Музей революции. – М., 1992. – С. 16–18.

4. *Зиновьева, Ю. В*. О функциях музея / Ю. В. Зиновьева // Музей в современной культуре: сб. науч. тр. – СПб.: Академия культуры, 1997. – С. 259–269.

5. *Никишин, Н. А*. «Язык музея» как универсальная моделирующая система музейной деятельности / Н. А. Никишин // Проблемы культурной коммуникации в музейной деятельности. Музееведение: сб. науч. тр. – М.: НИИК, 1989. – С. 12.

6. *Пшеничная, С. В*. Музей как социокультурный феномен. Информационно-коммуникативная модель / С. В. Пшеничная. – СПб.: Образование, 1999. – 185 с.

7. *Сапанжа, О. С*. Основы музейной коммуникации: учеб. пособие / О. С. Сапанжа. – СПб.: Гос. Рус. музей, 2007. – 116 с.

8. *Шляхтина, Л. М*. Современная методология реализации образовательной функции музея / Л. М. Шляхтина // Важский край: источниковедение, история, культура. – Вельск, 2004. – Вып. 2. – С. 125–139.

9. *Шляхтина, Л. М.* Основы музейного дела: теория и практика: учеб. пособие / Л. М. Шляхтина. – М.: Высш. шк., 2005. – 183 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ